*М.А.Бяспалая*
(Мінск)

# Сацыяльна-эканамічнае развіццё Вілейскага рэгіёна ў другой палове XIX ст.

Навуковая дзейнасць Я. і К. Тышкевічаў адбывалася ва ўмовах актыўнага эканамічнага развіцця іх уладанняў, што з'яўлялася трывалым падмуркам для разнастайных заняткаў братоў. Нельга не звярнуць увагу на тое, што апошнія гады іх дзейнасці супалі не толькі з хваляй патрыятычнага ўздыму, што адбіўся ў паўстанні 1863–64 гг., але са станоўчымі зрухамі ў эканамічным жыцці, якія звязаны з ажыццяўленнем рэформы 1861 г., заканчэннем так званага рамантычнага перыяду ў грамадскім руху і пераходам да вытворчай працы на сваёй зямлі, якую продкі пакалення 1860-х гг. плугам рэзалі.

На працягу другой паловы XIX ст. у розных месцах Беларусі скла́ліся буйныя цэнтры сацыяльна-эканамічнага развіцця, да іх адносіліся і ўладанні братоў Тышкевічаў і іх спадкаемцаў. Вілейскія ўладанні з'яўляліся прыкметным эканамічным цэнтрам рэгіёна. Побач з імі знаходзіліся дастаткова эканамічна развітыя маёнткі суседзяў – Любанскіх, Багдановічаў, Старжынскіх, Свентаржыцкіх, Скірмунтаў і інш. Аднак у навуковай літаратуры вельмі рэдка ўпамінаецца іх сацыяльна-эканамічная дзейнасць і значэнне яе не толькі для рэгіёна, але ў цэлым для Беларусі. Няма звестак аб прадпрымальніках рэгіёна і ў кнігах "Памяць" (Вілейскі і Мядзельскі раёны).

Мы не ставім задачу глыбокага даследавання асобных маёнткаў, нам падаецца цікавым вызначэнне пэўных заканамернасцей сацыякультурнага развіцця Вілейшчыны і прылеглых да яе тэрыторый, а таксама дзейнасці некаторых асоб і яе значэння для рэгіёна.

Да відавочных заканамернасцей вызначанага перыяду можна аднесці стварэнне ў большасці маёнткаў вінакурных

заводаў, якія працавалі на мясцовай сыравіне. Некаторыя ўладальнікі, напрыклад Міхал Свентаржыцкі, атрымалі неабходныя веды па аграноміі і вінаробству за мяжой. Нягледзячы на відавочныя сацыяльныя мінусы, якія суправаджалі стварэнне такіх прадпрыемстваў, можна адзначыць і станоўчыя моманты: вінакурныя заводы працавалі на мясцовай сыравіне, мелі дастаткова просты тэхналагічны працэс, высокадаходную прадукцыю і забяспечвалі працай пэўную колькасць мясцовых жыхароў.

Як дадаткі да вінакурных заводаў у многіх маёнтках працавалі смалярні, маслабойні, мела месца вытворчасць ільнянога і канаплянага масла, крухмалу, дражджэй і інш. Другім кірункам з’яўлялася ўдасканаленне сельскагаспадарчай вытворчасці – развядзенне пародзістай буйной рагатай жывёлы, іншай дамашняй жывёлы і птушкі, нават каштоўнага пушнога звера і інш. Напрыклад, яшчэ адзін з прадстаўнікоў сям’і Свентаржыцкіх, Баляслаў, у фальварку Грыцаў заснаваў рыбную гаспадарку, якая дзейнічае і сёння [2, с. 257], звярынец, у якім былі лані, фазаны, серны і іншыя жывёлы.

Такое дастаткова эфектыўнае эканамічнае развіццё закладвала грунтоўны падмурак для атрымання добрай адукацыі, нават за мяжой, стварэння добрых бібліятэк, набыцця твораў выяўленчага мастацтва, аздаблення сядзіб, закладкі рэгулярных паркаў з рэдкімі пародамі дрэў і інш. Астаткі былой прыгажосці ў некаторых мясцовасцях дачакаліся і нашых дзён. Гэтая акалічнасць выклікае цэлы букет пачуццяў – ад суму і роспачы да здзіўлення і захаплення, таму што, з аднаго боку, дэманструе нашу непавагу да мінулага, а з другога – адлюстроўвае факт існавання на нашай зямлі значнай колькасці багатых і культурных асяродкаў, тым больш, што многія з іх звязаны са знакамітымі асобамі нашай гісторыі і культуры. Напрыклад, Томаш Зан пасля вяртання са ссылкі на радзіму ажаніўся з дачкою Станіслава і Юстыны Свентаржыцкіх з Малінаўшчыны. На вянчанні ў Лебедзеўскім касцёле пры-

сутнічала Марыя Верашчака, яе муж і браты. Ці яшчэ адзін прыклад: уладальнікам Яхімоўшчыны пэўны час быў Вацлаў Свентаржыцкі, які з'яўляўся міністрам сельскай гаспадаркі Польшчы і пасля смерці ў 1934 г. быў пахаваны ў Яхімоўшчыне. Дарэчы, Яхімоўшчына на працягу XIX ст. часта пераходзіла ад адных уласнікаў да другіх: ад Сулістроўскіх да Вітгенштэйна, потым Я.Прушынскага, Я.Любанскага, А.Любанскага і нарэшце – да В.Свентаржыцкага. Нагадаем, што на бровары ў А.Любанскага ў 1906 г. некаторы час працаваў Янка Купала [2, с. 227].

Сацыяльна-эканамічнае і культурнае развіццё Вілейскага рэгіёна дэманструе яшчэ адну заканамернасць – існаванне пераемнасці сямейнага вопыту і традыцый, сувязей паміж прадстаўнікамі родаў, што, на наш погляд, станоўча ўплывала на фарміраванне адзінай эканамічнай і сацыякультурнай прасторы ў межах тагачасных беларускіх губерняў. Як выразны прыклад нашай думкі нагадаем сям'ю Скірмунтаў, карані якой знаходзіліся ў Пінскім Палессі. Аляксандр, старэйшы сын Шымона (Сымона) Скірмунта, у выніку шлюбу з Канстанцыяй, дачкою мінскага губернатара Казіміра Сулістроўскага, атрымаў у пасаг за жонкаю Шэметаўшчыну (Шэметава), што на памежжы Вілейшчыны і Мядзельшчыны. Па рашэнні сям'і гэтыя мясціны павінны былі стаць уласнасцю другога сына Канстанцыі і Аляксандра – Канстанціна, які нарадзіўся ў 1828 г. Пасля таго як ён узяў шлюб з Габрыэлай Умястоўскай з Ашмянскага павета, Шэметаўшчына стала іх радавым гняздом. Так Скірмунты замацаваліся далёка ад родных мясцін.

Канстанцін Скірмунт паказаў сябе такім жа здатным і прадбачлівым прадпрымальнікам, як яго дзед і бацька. Тыя ўменні, навыкі і веды, якія ён атрымаў на прадпрыемствах свайго бацькі ў Парэччы, Моладаве, былі скарыстаны ў Шэметаўшчыне. Маёнтак быў вялікім, 8784 моргі зямлі, на гэтай плошчы і разгарнулася рэфарматарская дзейнасць Канстанціна. Ён заснаваў гарбарны і цукровы заводы,

маслабойню, вядомы факты яго фінансавай дапамогі бедным студэнтам, падтрымкі выдавецкай дзейнасці, апекавання над паляпшэннем сялянскай гаспадаркі. Сучаснікі з павагаю ставіліся да такога пачынання К.Скірмунта, як стварэнне ў студзені 1877 г. ашчадна-крэдытнага таварыства, якое праз год ужо мела грашовы абарот амаль у 200 000 руб. Прыбытак на адзін рубель склаў больш 10 капеек [1, с. 214]. У 1880 г. у складзе таварыства налічвалася 384 сябры, а капітал быў больш за 17 000 руб., чысты прыбытак ад грашовых аперацый склаў 4 631 руб. [2, с. 149]. Захапляўся Канстанцін калекцыяніраваннем прадметаў мастацтва і даўніны.

Дарэчы, у "Энцыклапедыі гісторыі Беларусі" ўсе факты жыцця і дзейнасці Канстанціна Скірмунта аднесены да яго сына Казіміра. Поўная блытаніна са Скірмунтамі і ў артыкуле Ю.Жыгімонта, надрукаванага ў газеце "Советская Беларусь" 14 сакавіка 2009 г., у якім аўтар называе першага ўладальніка Шэметаўшчыны са Скірмунтаў – Баляславам.

Маёнтак Шэметаўшчына быў канфіскаваны за ўдзел яго ўладальніка ў паўстанні 1863 г., а ён сам адбываў пакаранне. Пасля канфіскацыі маёнтка ў сям'і застаўся толькі фальварак, але ў працэсе рэабілітацыі ўдзельнікаў паўстання маёнтак быў вернуты Скірмунтам. Старэйшы сын Канстанціна Скірмунта – Казімір, які нарадзіўся ў 1861г., прадстаўляе прыметную асобу ў нашай гісторыі. Ён закончыў гімназію ў горадзе Рыга, юрыдычны факультэт Дэрпскага ўніверсітэта, пэўны час працаваў у Маскве ў акруговым судзе. Потым Казімір прымае рашэнне прысвяціць сябе служэнню Богу, таму ён заканчвае Папскі Грыгарыянскі ўніверсітэт і акадэмію, у 1893 г. становіцца ксяндзом, праз два гады атрымоўвае званне доктара тэалогіі, актыўна публікуецца. Яго малодшы брат Баляслаў успамінаў: "З самага пачатку пантыфіката Льва XIII Казімір паехаў у Рым з сакрэтнай місіяй па вельмі важных справах Віленскай дыяцэзіі". Такія сакрэтныя місіі Казімір выконваў і ў далейшым, дарэчы, пэўны ўдзел у іх прымаў і малодшы

брат. Пасля абвяшчэння Польскай Рэспублікі ён займае пасаду кананічнага саветніка ў Рыме і з 1919 г. пражывае там. За сваю шматбаковую і плённую дзейнасць Казімір Скірмунт быў узнагароджаны польскім ордэнам "Polonia Restituta". Пасля смерці, якая наступіла ў 1931 г., быў пахаваны ў Рыме [3, с. 403].

Ад радавога маёнтка Казімір адмовіўся на карысць малодшага брата Баляслава, які стаў апошнім уласнікам Шэметаўшчыны. Ён актыўна прадаўжаў гаспадарчыя традыцыі сям'і Скірмунтаў. Вось як апісвае дзейнасць Баляслава вядомы папулярызатар крыніцазнаўчых ведаў Юры Жыгімонт у згаданым вышэй артыкуле: "…тут яшчэ захаваліся астаткі вінакурнага завода … А ад парка, у якім свабодна гулялі паўліны, алені, а ў аранжарэях раслі абрыкосы і ананасы, засталіся адны паданні … Аднак у прудах, дзе Баляслаў Скірмунт разводзіў карпа, рыбгас і зараз разводзіць рыбу … Увесь сядзібна-паркавы комплекс займаў плошчу амаль 100 га і быў адным з буйнейшых у беларускім краі".

Цікавая гісторыя звязана і са старэйшай сястрой Казіміра і Баляслава – Марыяй, якая лічылася батанікам ад нараджэння. Яна з захапленнем вывучала флору родных мясцін, стала аўтарам 13 работ, складзеныя ёю гербарыі і па сённяшні дзень захоўваюцца ў батанічных фондах. А замужам Марыя была за Пятром Твардоўскім з маёнтка Вялясніцы, што на Піншчыне, недалёка ад радавых уладанняў Скірмунтаў.

Такім чынам, можна заключыць нават на аснове прыведзеных намі фактаў, што эканамічнае жыццё Вілейшчыны ў другой палове XIX ст. вызначалася добра распланаванай і актыўнай прадпрымальніцкай дзейнасцю многіх сем'яў, яно стварала грунтоўны падмурак для іншых кірункаў сацыяльнага і культурнага развіцця.

1. *Живописная* Россія. Отечество наше в его зем., іст., плем., экон. і быт. значеніі: Літов. і Белорус. Полесье; Ре-

прінт. воспроізведеніе ізд. 1882 г. – Мн.: БелЭн, 1993. – 550 с.
2. *Федорук, А.Т.* Старинные усадьбы Минского края / А.Т.Федорук. – Мн.: Полифакт, 2000. – 416 с., ил. – (Сер. “Старинные усадьбы Беларуси”).
*3. Polski* słownik Biograficzny. Tom XXXVIII/2. – Warszawa-Kraków, 1998. – 431с.